View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

Котаў, А. І. Крыніцазнаўчая база гісторыі Беларусі перыяду Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў (1939—1945 гг.) / А. І. Котаў// Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 105-109

**А. І. КОТАЎ (Мінск)**

# КРЫНІЦАЗНАЎЧАЯ БАЗА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ (1939—1945 гг.)

Гісторыя Другой сусветнай вайны і яе важнейшай састаўной часткі Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа выклікала і прадаўжае выклікаць велізарную цікавасць шырокіх колаў грамадскасці і навуковай супольнасці. За шэсць дзесяцігоддзяў, мінуўшых пасля яе заканчэння, апублікавана мноства кніг. Сярод іх — шматтомныя абагульняючыя працы, гістарычныя нарысы, мемуары і дзённікі, каштоўныя дакументы і матэрыялы. Асвятленню падзей гісторыі Беларусі перыяду вайны ў айчыннай і зарубежнай гістарыяграфіі прысвечана звыш 10 тыс. навуковых і навукова-папулярных прац[1].

Уцешна канстатаваць, што гэты вялізны крыніцазнаўчы і гістарыяграфічны масіў працягвае папаўняцца ўсё новымі даследаваннямі зарубежных і беларускіх аўтараў. Сведчанне таму — выдадзеныя ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення 60-годдзя Вялікай Перамогі кнігі і падручнікі, а таксама апублікаваныя матэрыялы адбыўшыхся навуковых канферэнцый, творчыя дыскусіі, якія разгарнуліся на старонках часопісаў, газет і электронных СМІ Рэспублікі Беларусь. Паказальна, што сустрэчы, круглыя сталы і канферэнцыі



вучоных Інстытута гісторыі НАНБ, БДУ, БНТА, БДПУ імя Максіма Танка, МДЛУ, МДУ імя А. Куляшова і іншых беларускіх вышэйшых навучальных устаноў вызначаліся плюралізмам думак, імкненнем даць аб’ектыўную карціну мінулай вайны і суровых выпрабаванняў, выпаўшых на долю беларускага народа. Пры гэтым нашы вядучыя гісторыкі-палемолагі Э. Р. Іофэ, А. А. Каваленя, Г. А. Космач, У. І. Кузьменка, У. І. Лемяшонак, А.М. Літвін, С. Я. Новікаў, У. Е. Снапкоўскі, А. В. Шаркоў і некаторыя іх маладыя калегі дэманструюць уменне ўлічваць новыя тэндэнцыі і абапірацца на ўвесь назапашаны вопыт папярэдніх даследчыкаў.

Гэта надзвычай важная акалічнасць, таму што гістарыяграфія вайны прайшла даволі вялікі, складаны і нялёгкі шлях. Нашым папярэднікам Р. Ц. Абловай, Ц. С. Гарбунову, А. І. Залескаму, І. С. Краўчанку, Р. Р. Кручку, П. П. Ліпілу, Я. С. Паўлаву, В. П. Раманоўскаму, А. А. Фактаровічу, А. Ф. Хацкевічу, М. А. Якубоўскаму, Э. Ф. Языковіч і інш. прыходзілася пераадольваць многія аб’ектыўныя цяжкасці і неймаверныя перашкоды суб’ектыўнага характару — гэта доступ да дакументальных матэрыялаў, які быў празмерна абмежаваны; жорсткая цэнзура на іх публікацыю і г. д. Зыходзячы з гэтага, трактоўка і ацэнка многіх падзей грашылі аднабаковасцю і неаб’ектыўнасцю.

Можна выдзеліць чатыры асноўныя перыяды ў фарміраванні гістарыяграфіі аб вайне:

- першы пачынаецца з пачатку Вялікай Айчыннай вайны і працягваецца да сярэдзіны 50-х гг.;
- другі абмяжоўваецца сярэдзінай 60-х гг.;
- трэці працягваецца да сярэдзіны 80-х гг.;
- чацвёрты пачаўся з 1990-х гг.

Ужо на працягу першага перыяду была праведзена актыўная работа па зборы і апрацоўцы матэрыялаў. Менавіта ў гэты час выдаваліся першыя зборнікі дакументаў і ўспамінаў, даследаванні, якія абапіраліся на вузкую крынічную базу. Без перабольшвання можна лічыць знакавым у вывучэнні ваеннай гісторыі беларускага народа стварэнне Камісіі па гісторыі Айчыннай вайны, якая дзейнічала пры ЦК КП(б)Б з 1942 па 1946 г.

У актыве дзейнасці Камісіі — збор звыш 20 тыс. дакументаў аб подзвігах воінаў-беларусаў, працоўным гераізме нашых землякоў у савецкім тыле, зверстваў гітлераўцаў на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі, а таксама арганізацыя выставы ў залах Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве «Беларусь жыве, Беларусь змагаецца». Дзень адкрыцця апошняй (30 верасня 1943 г.) стаў пачаткам заснавання Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (БДМГВАВ), адчыненага ў Мінску 7 лістапада 1944 г., які і сёння з’яўляецца адным з важнейшых навукова-метадычных цэн-

траў музейнай справы Рэспублікі Беларусь і сапраўдным універсітэтам героіка-патрыятычнага выхавання працоўных і вучнёўскай моладзі[2].

Адметнай асаблівасцю гістарыяграфіі першага перыяду з’яўлялася апісальнасць, панаванне ідэалагічных штампаў і стэрэатыпаў, недастатковая аргументаванасць высноў. Даследаванні гэтага перыяду насілі апалагетычны характар: у іх утрымлівалася нястрымнае ўсхваленне «палкаводчага генія» і «мудрай празарлівасці» І. В. Сталіна; замоўчваліся негатыўныя бакі рэчаіснасці.Патрабавалася не адно дзесяцігоддзе, каб наш народ зведаў сапраўдную цану Перамогі — 27 млн чалавечых жыццяў, у тым ліку каля 3 млн грамадзян Беларусі.

З сярэдзіны 50-х гг. наступіла ажыўленне даследчыцкай думкі, выйшлі 6-томная гісторыя Вялікай Айчыннай вайны (М., 1960—1965), 12-томная гісторыя Другой сусветнай вайны (М., 1973—1982), мемуары і ўспаміны, у тым ліку і заснаваныя на беларускім матэрыяле. Разгляду ваенных падзей прысвечаны спецыяльны (чацвёрты) том фундаментальнай 5-томнай «Гісторыі Беларускай ССР» (Мінск, 1975). Абагульненне гістарычнага вопыту барацьбы на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі знайшло адлюстраванне ў 3-томным выданні «Всенародная борьба против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны» (Мінск, 1983—1985). Крыніцазнаўчая база папоўнілася зборнікамі архіўных дакументаў: «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Беларуси, 1941—1944» (Минск, 1965), «Всенародное партизанское движение в Беларуси в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941— июль

1944): Документы и материалы» (Т. 1—3. Минск, 1967—1982), «Комсомол Беларуси в Великой Отечественной войне: Документы и материалы» (Минск, 1988). Гэтыя і іншыя выданні даюць яскравае ўяўленне аб барацьбе беларускага народа супраць фашыстаў і маюць значную навуковую каштоўнасць. На жаль, ва ўсёй савецкай гістарыяграфіі не абышлося без спроб узвялічыць новага лідэра — М. С. Хрушчова, а потым — Л. І. Брэжнева. З канца 60-х гг. прыкметна запаволіўся працэс расшырэння крыніцазнаўчай базы.

І толькі з канца 80-х гг. пачаў набіраць сілу працэс адкрыцця і ўвядзення ў навуковы абарот раней недаступных гісторыкам дакументаў. Гэта дазволіла паглыбіць раскрыццё традыцыйных тэм і прыступіць к вывучэнню раней закрытых праблем, а галоўнае — вызваліць прынцып гістарызму ад дагматызаванага марксісцка-ленінскага падыходу, выкарыстаць сучасны цывілізацыйны, комплексны, сістэмны падыход. Толькі за апошні час (1991—2005 гг.) на аснове новага падыходу і выкарыстання рассакрэчаных дакументаў апублікаваны дзесяткі зборнікаў і навуковых прац[3].

Абапіраючыся на сучасны ўзровень развіцця зарубежнай і айчыннай гістарыяграфіі, беларускія вучоныя замацоўваюць пазітыўныя тэндэнцыі, сканцэнтроўваюць увагу на самых важных, а таксама малавядомых пытаннях вай-



ны. Імі ў апошні час, асабліва пасля выхаду ў свет Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб падрыхтоўцы і правядзенні 60-годдзя Вялікай Перамогі[4], на аснове дыхтоўных публікацый і архіўных крыніц падрыхтаваны і выдадзены шэраг абагульняючых фундаментальных прац аб Беларусі ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў[5].

Крыніцазнаўчая база ваеннай гісторыі Беларусі папоўнілася новымі навукова-папулярнымі і даведачнымі выданнямі, а таксама зборнікамі архіўных дакументаў6. Беларускія гісторыкі лічаць неабходным звярнуцца перш-наперш да праблем, якімі раней не займаліся альбо займаліся недастаткова. Таму ў цэнтры сучасных даследчыкаў знаходзяцца такія пытанні, як: мабілізацыйная гатоўнасць Савецкага Саюза і яго заходніх рубяжоў — тэрыторыі Заходняй Асобай ваеннай акругі, якая стала з першых дзён вайны Заходнім фронтам; прычыны трагічнага для Чырвонай Арміі і ўсяго савецкага народа пачаткова-га перыяду вайны; уклад беларускага народа ў перамогу над фашызмам.

Наспеў час для ўсебаковага комплекснага даследавання такіх важных праблем, як народ і вайна, вайна і грамадства, вайна і духоўна-культурнае жыццё, узаемадзеянне часцей рэгулярнай Чырвонай Арміі з дзейнасцю патрыятычных падпольных арганізацый і партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі. Патрабуецца ў поўнай меры раскрыць метады супрацьдзеяння насельніцтва, у тым ліку розных сацыяльных, рэлігійных, дэмаграфічных слаёў і асабліва моладзі, спробам праціўніка ажыццявіць акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. Яшчэ застаецца на будучае сур’ёзная работа, каб даць аб’ектыўнае, глыбокае і поўнае

асвятленне праблем, якія маюць дыскусійны характар, у тым ліку праблемы беларускай калабарацыі, лёсаў ваеннапалонных, адміністрацыйна-тэрытарыяльных змен Беларусі. Гэта тым больш важна, што пры падрыхтоўцы шэрага прац, на маю думку, былі дапушчаны пэўныя промахі: у пераважнай большасці прац не пазначаны час і месца першай публікацыі выкарыстоўваемых архіўных крыніц; некаторыя дакументы перададзены са значнымі купюрамі; іншыя няправільна атрыбутаваны; часам дапускаецца нават «разнабой» пры асвятленні адной і той жа гістарычнай падзеі. Раскрываючы, напрыклад, уклад партызан у перамогу над захопнікамі, аўтары вучэбнага дапаможніка на адной старонцы сцвярджаюць, што беларускія патрыёты захапілі ў ворага 363 гарматы і мінамёты, а на другой — знішчылі 438 гармат[7].

Для вырашэння надзённых задач па далейшым вывучэнні і даследаванні ваеннай гісторыі Беларусі патрэбна пільна працягваць работу па ўвядзенні ў навуковы абарот новых архіўных дакументаў і матэрыялаў, выпрацоўцы дзейсных крытэрыяў навуковага падыходу, уніфікацыі навуковай тэрміналогіі, нарэшце, падрыхтоўцы фундаментальнага абагульняючага зборніка дакумен-



таў па разглядаемай праблематыцы. Усё гэта, бясспрэчна, будзе садзейнічаць праўдзівай аб’ектыўнай ацэнцы ўкладу беларускага народа ў разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у забеспячэнне свабоды і незалежнасці сваёй краіны, захаванне і развіццё сусветнай цывілізацыі.

---

[1] Война 1941—1945 годов: современные подходы (отв. ред. А. Н. Сахаров. М.: Наука, 2005. С. 45.

[2] БДМГВАВ. Фонды, н/д 5840; НАРБ. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1251. Л. 57; Шумейко М.Ф. Деятельность Комиссии по истории Отечественной войны при ЦК КП(б)Белоруссии. 1942—1946 гг. // Советские архивы. 1985. № 2. С. 36—42.

[3] Гл.: Стратегический очерк Великой Отечественной войны 1941—1945. М., 1961 (рассекречен в 1992 г.); Накануне войны: материалы совещания высшего руководящего состава РККА 23—31 декабря 1940 года. М., 1993; Мировые войны XX века. Кн. 4: Вторая мировая война. Документы и материалы. Раздел II. М., 2002; Кульков Е. Н., Мягков М. Ю., Ржешевский О. А. Война, 1941—1945: Факты и документы. М., 2001; Зенько-

вич Н. А. Чья Белоруссия? Границы. Споры. Обиды. М., 2002; Война 1941—1945 годов: современные подходы.

[4] Указ Президента Республики Беларусь от 22 ноября 2002 г. № 579 «О подготовке и проведении празднования 60-й годовщины освобождения Республики Беларусь от немецко-фашистских захватчиков и Победы советского народа в Великой Отечественной войне» // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. 2002. № 133. С. 6.

[5] Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. коллектива), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко, И. И. Басик, И. А. Валаханович, Ю. В. Грибовский, Г. Д. Кнатько, В. И. Лемешонак, С. Е. Новиков, М. Ф. Шумейко. Минск : БелТА, 2005.

[6] Беларусь у перыяд Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны (1939—1945 гг.): Дакументы і матэрыялы / аўт.-склад. А. І. Котаў. Мінск : БДУ, 2004; Освобожденная Беларусь. Документы и материалы: в 2 кн. / сост.: В. И. Адамушко [и др.]. Мінск : НАРБ, 2004—2005.

[7] Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2004. С. 155, 156.